# Новости

Достижения

17.01.2025

## 30 гадоў поспехаў і інавацый: БДУІР паказаў свае дасягненні на выставе «Мая Беларусь»(+відэарэпартаж)

**28 снежня адкрылася выстава «Мая Беларусь», на якой экспануюцца галоўныя дасягненні прамысловасці, навукі, адукацыі і спорту нашай краіны за больш чым 30 гадоў незалежнасці.**

Тэхналагічныя вынаходкі Беларусі занялі больш за 30 000 кв.м. новага Міжнароднага выстаўнага цэнтра. Для наведвальнікаў даступна адзінаццаць тэматычных зон: «Знак якасці», «Культурная спадчына», «Мы - будучыня», «Разумны горад», «Прыгожая краіна», «Навука і інтэлект», «Клопат і здароўе», «Спартыўная краіна», «На варце», «Атамная энергія» і «Сельская гаспадарка».

На кожнай з лакацый прысутнічаюць інтэрактыўныя элементы. Можна паспрабаваць сячы дрэвы на сімулятары ці ўбачыць свой пашпарт вачымі беларускіх мытнікаў пад ультрафіялетавай лямпай.






BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR


BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR

У выставе са сваімі дасягненнямі актыўны ўдзел узяў і наш універсітэт. Высокатэхналагічныя распрацоўкі пададзены на дзвюх пляцоўках: «Мы — будучыня» і «Навука і інтэлект». Убачыць у дзеянні можна будзе навучальны комплекс для вывучэння праграмавання ўбудаваных сістэм на базе мікракантролера STM32; прыладу абароны маўленчай інфармацыі «Прыбой»; комплекс для навучання аператараў беспілотных лятальных апаратаў і іншыя распрацоўкі ўніверсітэта.

Шмат экспанатаў БДУІР інтэрактыўныя. Так, ля ўваходу на лакацыю «Мы — будучыня» дэманструецца праграмнае забеспячэнне для аналізу кліенцкага досведу з выкарыстаннем нейрасетак і сродкаў відэаааналітыкі. На выставе прылада падлічвае колькасць наведвальнікаў, колькі часу яны знаходзіліся каля экрана, а таксама паказвае, колькі чалавек зараз знаходзіцца ў кадры.

*«У нас ёсць адмысловы рэкорд. У адзін з выхадных дзён нашу пляцоўку наведалі больш за 20 000 чалавек. Гэта падлічыла наша сістэма»*, — падзялілася інфармацыяй **Марыя Баранава**, загадчык студэнцкай навукова-даследчай лабараторы БДУІР.

Убачыць дасягненні сучаснай Беларусі ўжывую можна па 26 студзеня ў Мінску. Выстава адкрыта штодня па адрасе вул. П.Мядёлкі, 24.




4-DIGIT 7-SEGMENT DISPLAY
BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR


Белорусский государственный университет информатики и радиоэлектроники
КОМПЛЕКС ДЛЯ ОБУЧЕНИЯ ОПЕРАТОРОВ БЕСПИЛОТНЫХ ЛЕТАТЕЛЬНЫХ АППАРАТОВ
СОДЕРЖАНИЕ
– теоретическая подготовка
– виртуальный тренажер
– практическое обучение
– итоговая аттестация
Срок обучения – 1 неделя
Состав группы – 16 человек
По результатам обучения выдается сертификат
УЧЕБНЫЙ КЛАСС
BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR


BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR


BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR



https://youtu.be/ed4o0n5hEF8

Падрыхтавана прэс-службай
Фота Андрэя Сіняўскага